# § 13. Узаемадзеянне асобы і дзяржавы

## Як звязаны асоба і дзяржава?




**Дзяржава і яе прыметы.** Прававыя нормы, што выступаюць складнікам сістэмы сацыяльных нормаў, вызначае дзяржава. У сучасным разуменні **дзяржава** — адзіная палітычная арганізацыя грамадства, якая распаўсюджвае ўладу на ўсю сваю тэрыторыю і насельніцтва, валодае спецыяльным апаратам кіравання і прымусу, выдае абавязковыя для ўсіх законы і валодае суверэнітэтам. Як вядома, першыя дзяржавы з'явіліся ў Старажытным Міжрэччы і Егіпце на мяжы IV—III тысячагоддзяў да н. э.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Як называліся першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі? Які горад называюць калыскай беларускай дзяржаўнасці? Які малюнак вы скарысталі б для ілюстрацыі адказу на пытанне? Чаму? ■



Найважнейшымі прыметамі дзяржавы з'яўляюцца: тэрыторыя, насельніцтва, улада, права, суверэнітэт. Разгледзім іх больш падрабязна.

Дзяржава ўзнікла з неабходнасці рэгуляваць сумеснае жыццё і дзейнасць людзей, падтрымліваць парадак і стабільнасць. Таму ў дзяржаве існуе сістэма спецыяльных органаў, праз якія рэалізуецца дзяржаўная *ўлада*. Улада — гэта здольнасць і магчымасць ажыццяўляць сваю волю, уздзейнічаць на дзейнасць і паводзіны іншых людзей.

Дзяржава немагчымая без *тэрыторыі*, у межах якой улада дзяржавы распаўсюджваецца на ўсіх членаў грамадства. Натуральнай умовай існавання дзяржавы, яе галоўным рэсурсам з'яўляецца насельніцтва. *Насельніцтва* — гэта сукупнасць грамадзян, а таксама замежных асоб і асоб без грамадзянства, на якіх распаўсюджваецца ўлада дзяржавы. Грамадзянамі з'яўляецца большасць людзей, якія жывуць на тэрыторыі дзяржавы. Грамадзяне валодаюць пэўнай сукупнасцю правоў і абавязкаў, звязанай з іх прыналежнасцю да гэтай краіны. Такой сукупнасцю правоў і абавязкаў не валодаюць неграмадзяне, якія знаходзяцца на тэрыторыі краіны (асобы без грамадзянства і грамадзяне іншых дзяржаў).

Дзяржава непарыўна звязана з *правам*. Толькі дзяржава ў асобе сваіх органаў выдае такія нормы, якія з'яўляюцца абавязковымі для ўсяго насельніцтва краіны. У дзяржаве існуюць спецыяльныя органы прымусу выканання праваых прадпісанняў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Суверэнітэт* дзяржавы азначае вяршэнства ўлады дзяржавы ў межах яе тэрыторыі і незалежнасць дзяржавы ў міжнародных адносінах. Ніякія арганізацыі або людзі ўнутры гэтай дзяржавы не могуць скасаваць рашэнні дзяржаўных органаў, і ніякія іншыя арганізацыі або асобы не могуць уступаць у зносіны з іншымі дзяржавамі або арганізацыямі ад імя дзяржавы, калі такія паўнамоцтвы не нададзены адмысловым чынам.

Сімваламі суверэннай дзяржавы з'яўляюцца Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн.

Прыгадайце, што сімвалізуюць колеры і элементы на Дзяржаўным сцягу і Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь. Калі святкуецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь? ■

Даведайцеся, што азначаюць колеры і элементы на дзяржаўных сцягах і гербах краін, з якімі мяжуе Беларусь. ■




**Права ў сістэме сацыяльных нормаў.** Права можна разглядаць у двух асноўных значэннях: як сістэму нормаў і як канкрэтную магчымасць чалавека (права на адукацыю, права на працу і да т. п.). У другім выпадку гаворка звычайна ідзе аб правах чалавека.

Разгледзім права як сістэму нормаў. **Права** — гэта сукупнасць нормаў, правілаў, вызначаных дзяржавай. Права з'яўляецца галоўным сродкам дзяржаўнага кіравання жыццём грамадства.

Прававыя нормы, як і нормы маралі, рэгулююць грамадскія адносіны. Іх агульнай мэтай з'яўляецца ўпарадкаванне адносін паміж людзьмі, выпрацоўка прымальных для грамадства нормаў і каштоўнасцей, замацаванне найбольш эфектыўных формаў паво-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

дзінаў. Прававыя і маральныя нормы з’яўляюцца галоўнымі сацыяльнымі рэгулятарамі і функцыянуюць у грамадстве адначасова, аказваючы значны ўплыў і ўзаемадапаўняючы адна адну. Разам з тым паміж мараллю і правам ёсць шэраг істотных адрозненняў.

| Мараль | Права |
|---|---|
| **Час узнікнення** | |
| З узнікненнем самога грамадства | З узнікненнем дзяржавы |
| **Калі нормы набываюць сілу?** | |
| Па меры прымання і выканання большасцю людзей | Пасля прымання дзяржаўнымі органамі, незалежна ад жадання людзей |
| **Дзе нормы ўтрымліваюцца?** | |
| У індывідуальнай і грамадскай свядомасці | У афіцыйных дакументах у пісьмовым выглядзе (кадыфікаваныя) |
| **Наколькі канкрэтныя нормы?** | |
| У агульнай форме вызначаюць, што ёсць зло (напрыклад: «не крадзі») | Вызначаюць канкрэтную меру зла (напрыклад: крадзеж, рабаванне і г. д.) |
| **Якія адносіны рэгулююцца нормамі?** | |
| Усе адносіны ў грамадстве з пазіцыі адрознівання дабра і зла, добрага і дрэннага | Тыя грамадска значныя адносіны, якія паддаюцца знешняму кантролю |
| **Наколькі абавязкова выконваць нормы?** | |
| Выкананне з’яўляецца добраахвотным і ажыццяўляецца чалавекам на падставе ўласнага выбару | Выкананне з’яўляецца абавязковым (прававая свабода аднаго не можа перашкаджаць прававой свабодзе другога) |
| **Да чаго прыводзіць невыкананне нормаў?** | |
| Пакуты сумлення і ўздзеянне на чалавека праз грамадскую думку | Санкцыі з боку дзяржаўных органаў |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У пераважнай большасці выпадкаў прававыя нормы выконваюцца добраахвотна, паколькі яны адпавядаюць маральным уяўленням грамадзян пра справядлівае і несправядлівае. Веданне прававых нормаў, павага да закону і правапарадку, а таксама паводзіны, якія адпавядаюць нормам права, характарызуюць *прававую культуру асобы*.

**Грамадзянства як прававая сувязь чалавека з дзяржавай.** Прававыя нормы, вызначаныя беларускай дзяржавай, на тэрыторыі нашай краіны абавязана выконваць усё насельніцтва — як грамадзяне, так і асобы без грамадзянства, замежныя грамадзяне. Беларускія грамадзяне таксама абавязаны выконваць прававыя нормы тых краін, у якіх яны часова знаходзяцца або пастаянна пражываюць. Што ж такое грамадзянства?

**Грамадзянства** — гэта прававая сувязь чалавека і дзяржавы, якая выяўляецца ў сукупнасці іх узаемных правоў, абавязкаў і адказнасці.

У Рэспубліцы Беларусь існуюць наступныя магчымасці атрымання грамадзянства.

**Набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь**

| Па нараджэнні | Прыём у грамадзянства ў парадку рэгістрацыі |
|---|---|
| • Калі адзін ці абое бацькоў дзіцяці з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь<br>• Калі дзіця нарадзілася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь | • Чалавек дасягнуў 18 гадоў<br>• Бярэ на сябе абавязкі выконваць і паважаць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і іншыя заканадаўчыя акты<br>• Ведае адну з дзяржаўных моў<br>• Пастаянна жыве на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь апошнія 7 гадоў<br>• Мае законную крыніцу даходаў<br>• Не мае грамадзянства іншай дзяржавы |

Грамадзяніну Рэспублікі Беларусь гарантуецца абарона і заступніцтва дзяржавы як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе ме-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

жамі. Грамадзянін Рэспублікі Беларусь, у сваю чаргу, павінен паважаць і выконваць Канстытуцыю і іншыя законы беларускай дзяржавы. Ніхто не можа быць пазбаўлены грамадзянства Рэспублікі Беларусь або права змяніць грамадзянства. Грамадзянства Рэспублікі Беларусь з'яўляецца неад'емным атрыбутам (прыметай) дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.




Асноўным дакументам, які пацвярджае асобу грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца пашпарт. Яго абавязаны мець усе грамадзяне, якія дасягнулі 14 гадоў.

На старонцы 2 пашпарта запісана: «Пашпарт з'яўляецца ўласнасцю Рэспублікі Беларусь. Уладальнік гэтага пашпарта знаходзіцца пад абаронай Рэспублікі Беларусь».

Выкарыстоўваючы свой пашпарт, раскажыце, якая інфармацыя пра грамадзяніна ў ім утрымліваецца. ■

Такім чынам, грамадзянін — гэта чалавек, які мае прававую сувязь з пэўнай дзяржавай, што дазваляе яму мець усе правы, якія надаюцца законамі гэтай краіны, і выконваць усе ўстаноўленыя законамі абавязкі. Паняцце «грамадзянін» звязана з такімі паняццямі, як «грамадзянства» і «грамадзянскасць». *Грамадзянскасць* — гэта ўсведамленне сябе грамадзянінам сваёй краіны, што выяўляецца ў адпаведных паводзінах, гатоўнасці актыўна ўдзельнічаць у жыцці грамадства і дзяржавы, спрыяць росквіту сваёй краіны.

Рэспубліка Беларусь у сваіх законах і практыцы цвёрда прытрымліваецца прынцыпу роўнасці ўсіх грамадзян перад законам, незалежна ад іх прыбытку, уплыву, родных сувязяў і г. д. Усе грамадзяне нашай дзяржавы, незалежна ад этнічнага паходжання, складаюць беларускі народ у канстытуцыйна-прававым яго разуменні.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

?

1. Ахарактарызуйце Рэспубліку Беларусь як дзяржаву, выкарыстоўваючы асноўныя прыметы дзяржавы.
2. Навошта грамадству патрэбны і маральныя, і прававыя нормы? Чаму прававыя нормы не выцясняюць маральных нормаў?
3. У чым падабенства і адрозненне паміж паняццямі «грамадзянства» і «грамадзянскасць»? Які сэнс вы ўкладаеце ў паняцце «грамадзянін»?
4. Якую назву: «Беларусь» або «Рэспубліка Беларусь» — вы скарыстаеце, каб расказаць пра нашу краіну? Якую назву вы скарыстаеце, калі гаворка будзе ісці пра нашу дзяржаву? У чым розніца паміж гэтымі назвамі?
5. Артыкул 40 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь вызначае права кожнага накіроўваць асабістыя і калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы.

   Як вы лічыце, чаму ў пісьмовым звароце абавязкова павінна быць указана:
   - назва і (або) адрас дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі, у якія накіроўваецца зварот;
   - прозвішча, імя і імя па бацьку грамадзяніна, звесткі пра яго месца жыхарства і (або) працы (вучобы);
   - выкладанне сутнасці звароту (заявы, скаргі);
   - асабісты подпіс грамадзяніна?

Выкарыстоўваючы веды з гісторыі, выканайце міні-праект «Вехі станаўлення беларускай дзяржаўнасці».



Правообладатель Адукацыя і выхаванне